## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*

*УДК 39(=161.3)*

*А. І. ЛАКОТКА*

# НАРОДНА-ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА І ЗАДАЧЫ ДЗЯРЖАВЫ Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНЫХ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ПРАЦЭСАЎ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 08.04.1014)*

Народна-традыцыйная культура на фоне глабальных крызісных з'яў у экалогіі, эканоміцы, міжэтнічных і міжканфесійных зносін сёння бачыцца як падмурак для развіцця і захавання культурнай, моўнай, этнічнай разнастайнасці сусветнай цывілізацыі. Ужо немагчыма ігнараваць наступствы канфліктаў, якія назіраюцца ў краінах Еўропы ў выніку працэсаў мадэрнізацыі культур, адмаўлення традыцый, адсутнасці рэлігійнай і міжэтнічнай талерантнасці. Рэанімацыя нацыяналістычных настрояў, крызіс інстытутаў традыцыйнай сям'і і шлюбу, канфлікты на рэлігійнай аснове ў краінах Старога Свету ўяўляюць небяспеку для славянскіх краін, краін былога СССР.

Нягледзячы на драматычныя падзеі XX стагоддзя, рэвалюцыю, дзве сусветныя вайны, распад Расійскай імперыі і распад СССР, Беларусь захавала сваю народна-традыцыйную культуру. Сацыяльна-гаспадарчыя пераўтварэнні ў выніку калектывізацыі і індустрыялізацыі не разбурылі яе асноў.

**1. Народна-традыцыйная культура і сучасныя этнічныя працэсы.**

Сучасны стан сацыяльна-грамадскага і культурнага развіцця знаходзіцца пад знакам глабальных працэсаў мадэрнізацыі. Сёння на захаванне і развіццё аўтэнтычных форм народна-традыцыйнай культуры ўплываюць наступныя фактары:

– мадэрнізацыя сферы культуры, у тым ліку традыцыйных форм;

– супярэчнасць паміж культурай горада і вёскі;

– супярэчнасці ва ўзаемадзеянні традыцыйных і авангардных напрамкаў, масавай поп-культуры;

– камерцыялізацыя культуры, распаўсюджванне вытворных форм, тыражаванне спажывецкіх сувенірных, відовішчных прадуктаў;

– праблема захавання аўтэнтычнага асяроддзя, прадметаў, атрыбуцыі і г.д.;

– небяспека страты традыцыйных шляхоў трансляцыі, спадчыннай перадачы ведаў паміж пакаленнямі;

– суадносіны традыцыйных форм і міжэтнічных працэсаў, міжэтнічнага культурнага абмену (аўтэнтычнасць і запазычанні);

– сучасная сфера адукацыі і народная педагогіка, выхаванне павагі да культурных традыцый;

– сродкі масавай інфармацыі і фарміраванне культурнай ідэнтычнасці;

– дэфіцыт культурнай ідэнтычнасці ў прафесійных формах мастацкай культуры: архітэктуры, тэатры, шоу-бізнесе і г. д.;

– зніжэнне ролі традыцый у сямейным і грамадскім побыце.

Для забеспячэння ўстойлівага існавання народна-традыцыйнай культуры неабходна новая ідэалагічная парадыгма, дзякуючы якой культурная аўтэнтыка магла б знайсці сваё месца ў грамадскай свядомасці, у тым ліку максімалісцкім светапоглядзе моладзі. Наспела прыняцце спецыяльнага заказу аб фальклоры. Неабходныя змяненні павінны быць узнесены ў праграмы адукацыі і выхавання дзеля фарміравання паступовага свядомага разумення сваёй ідэнтычнасці.

Сціранне грані паміж горадам і вёскай – утопія. Пакуль будзе існаваць хлебная ніва, будуць існаваць сядзібы, сёлы, вяскоўцы і іх спецыфічная культура. Культурная спадчына прашчураў і сёння, як і хлеб, сілкуе дух вяскоўца і гараджаніна, мастака і інжынера, народа краіны.

Аўтэнтычная культура ў інфармацыйнай прасторы не для таго, каб бавіць час, а для размовы з мінулым, з поглядам на будучыню, з імкненнем захаваць этнічную, моўную і культурную разнастайнасць свету.

**2. Матэрыяльная культура.**

Калгасная палітыка, Вялікая Айчынная вайна, пасляваенныя аграрныя рэформы, «харчовая праграма» 1980-х гадоў прывялі да карэнных змяненняў сельскага расселення. Дробныя вёскі былі абвешчаны бесперспектыўнымі. За другую палову мінулага стагоддзя колькасць сельскіх паселішчаў на Беларусі скарацілася з 32 да 24 тысяч. Узнікла пагроза страты традыцыйных аўтэнтычных узораў народнага дойлідства, матэрыяльна-побытавай культуры.

Прадстаўнікі навуковай і творчай інтэлігенцыі, вядомыя вучоныя, пісьменнікі, мастакі ў 1970-я гады выступілі са зваротам да Урада рэспублікі з прапановай стварыць пад Мінскам Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту пад адкрытым небам, у якім сабраць узоры народна-традыцыйнай культуры ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў. Ідэя такіх музеяў у Еўропе ўзнікла ў канцы XIX ст. Экспазіцыі ўзораў народна-традыцыйных культур на сусветных выстаўках у Лондане, Парыжы, Вене ў XIX ст. адлюстроўвалі ідэнтычнасць еўрапейскіх індустрыяльных дзяржаў.

Беларускі Урад падтрымаў ідэю і ў 1976 годзе была прынята адпаведная пастанова.

Стварэнне беларускага скансэна актывізавала даследаванні народна-традыцыйнай культуры. У навуковым звароце з'явілася новае паняцце: помнік этнаграфіі. За час сумесных экспедыцый акадэмічных этнографаў з супрацоўнікамі Рабочай групы па стварэнні музея з 1977 па 1987 г. (год адкрыцця першай чаргі музея) было выяўлена каля 5 тысяч помнікаў народнай архітэктуры і сабрана каля 50 тысяч прадметаў этнаграфіі.

Стварэнне Белдзяржмузея народнай архітэктуры і побыту актывізавала развіццё ў рэгіёнах краязнаўчай работы. На мясцовым узроўні вядзецца стварэнне этнаграфічных экспазіцый у раённых краязнаўчых, школьных музеях. У канцы 1980 – пачатку 1990-х гадоў з'яўляюцца рэгіянальныя і лакальныя музеі пад адкрытым небам: у Глушы Бабруйскага, Моталі Іванаўскага раёнаў, у Заслаўі, Гудзевічах Мастоўскага, Дудутках Пухавіцкага раёнаў і інш.

З утварэннем сучаснай незалежнай Беларусі народна-традыцыйная культура стала аб'ектам дзяржаўнага клопату. Яе захаванне, падтрымка і развіццё замацаваны ў законах аб культуры, аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, аб народных промыслах і рамёствах, народнай творчасці і г. д. Дзяржава клапоціцца аб захаванні рэгіянальнай культурнай разнастайнасці, развіцці культуры этнічных груп і дыяспары.

Дзяржаўная падтрымка, развіццё турызму, стварэнне сеткі мясцовых студый і гурткоў, школ народнай творчасці спрыяюць рэгіянальнаму развіццю народных культурных традыцый.

У Брэсцкай вобласці сёння працуюць 8,5 тысяч народных майстроў па 40 відах рамёстваў. Актыўна развіваюцца ткацтва і вышыўка, карункавае пляценне, разьбярства і бандарства, драўляная скульптура, інкрустацыя, выцінанка, ганчарства, кавальства. Звыш 300 народных майстроў вобласці рыхтуюць маладую змену ў школах народнай творчасці, гуртках і г.д.

Дваццаць цэнтраў народных рамёстваў дзейнічае на Віцебшчыне. На захадзе рэгіёна развіты ткацтва, вышыўка, выраб традыцыйных дываноў і габеленаў. На ўсходзе, у Дуброўне і Копысі, жывуць майстры, што займаюцца вытворчасцю вырабаў з гліны (кафля, цацкі, посуд).

Каля двух дзясяткаў цэнтраў і дамоў рамёстваў дзейнічае на Гомельшчыне. Асабліва вылучаюцца Веткаўскі, Добрушскі, Гомельскі раёны, славутыя ткацтвам, разьбярствам, узорамі народнай архітэктуры. Дзякуючы рабоце ў 1990-х гадах у рэгіёне спецыяльнай Чарнобыльскай экспедыцыі выратаваны і перададзены музеям шматлікія помнікі этнаграфіі і народна-традыцыйнага мастацтва. Унікальны краязнаўчы музей у г. Ветка ў свой час адмовіўся ад эвакуацыі, і яго дзейнасць сёння робіць істотны ўклад у справу захавання народна-традыцыйнай спадчыны пацярпелых ад Чарнобыльскай аварыі раёнаў.

Каля 6000 народных майстроў працуе ў Панёманні (Гродзеншчына). Папулярнасцю ў турыстаў карыстаецца чорналашчоная Поразаўская кераміка, Ваўкавыская кафля, рознакаляровыя

ваўняныя дываны. Кірмашы народных майстроў традыцыйна праводзяцца ў Міры і Навагрудку, Слоніме, Ашмянах, Зэльве.

У Мінскай вобласці (Цэнтральны рэгіён) сёння дзейнічае каля тысячы гурткоў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і рамёстваў. Каля 800 з іх – дзіцячыя. У рэгіёне каля трох дзясяткаў клубаў майстроў народнай творчасці, большасць з якіх маюць назву «народны». Яны аб'ядноўваюць каля чатырох тысяч народных умельцаў. Шырока вядомы Івянецкая кераміка, Старадарожскае ткацтва, вырабы народных майстроў Любаншчыны, Капыльшчыны, Налібоцкага краю.

Каля двух тысяч майстроў і ўмельцаў працуюць на Магілёўшчыне. Амаль у кожным раёне ёсць дамы рамёстваў, працуе каля двухсот гурткоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прыкладна 150 з іх – дзіцячыя. Час адраджэння перажываюць традыцыі дрыбінскіх фолюшнікаў і шапавалаў. Школы народных майстроў працуюць у Бабруйску, цэнтр народных рамёстваў – у гарадскім пасёлку Глуша.

Разам з тым, імкненне майстроў задаволіць спажывецкія патрэбы рынку прыводзіць да скажэння і страты аўтэнтычнасці твораў. Натуральна, што выкарыстанне сучасных матэрыялаў непазбежна пры масавасці вырабаў народна-традыцыйнага мастацтва ў якасці сувенірнай прадукцыі. Але таленавітыя майстры прапануюць узоры ткацтва, керамікі, саломапляцення і г. д., выкананыя з натуральных высакаякасных традыцыйных матэрыялаў, якія, нягледзячы на высокі кошт, карыстаюцца попытам у турыстаў, калекцыянераў, музейных устаноў.

Наспела неабходнасць стварэння дзяржаўнага музея народна-прыкладнога мастацтва. Ён патрэбны не толькі для пазіцыянавання ўнікальных твораў народных майстроў у іх рэгіянальнай разнастайнасці, не толькі як нацыянальны фонд, але і як навукова-метадычны цэнтр. Тут павінна быць прадстаўлена ўся рэгіянальная і лакальная разнастайнасць традыцыйнай народнай мастацкай культуры.

Заклапочанасць выклікае захаванне і развіццё народнага дойлідства. Збудаванні «пад драўляную архітэктуру» не вытрымліваюць крытыкі. Прыклады – рэканструкцыя фрагментаў Мазырскага замка з ацыліндраванай драўніны, этнаграфічная вёска ў Буйнічах пад Магілёвам, Цэнтр народных рамёстваў у г. п. Глуша.

Яшчэ ў большай ступені адзначанае тычыцца аграсядзіб. Вырашэнне названай праблемы важна для фарміравання архітэктуры аграгарадкоў. Іх забудова часта уступае ў канфлікт з захаванымі па суседству сядзібна-паркавай, царкоўнай архітэктурай, традыцыйнай вясковай забудовай, гістарычнымі дарогамі.

Крыніцай вырашэння праблемы можа быць ахова і рэканструкцыя забудовы гістарычных вёсак, мястэчак, прадмесцяў гарадоў, музеефікацыя архітэктуры гарадскіх прадмесцяў з экспанаваннем узорных помнікаў.

**3. Духоўная культура і нематэрыяльная культурная спадчына.**

Адной з чысцейшых крыніц народна-традыцыйнага светапогляду беларусаў з'яўляецца духоўная культура. Нягледзячы на войны, паўстанні, сацыяльныя канфлікты, беларуская народная вусна-паэтычная і песенная творчасць захавала чысціню, яркія самабытныя фарбы на здзіўленне еўрапейскіх народаў і краін, чыя духоўная спадчына страціла арыгінальнае аблічча пад ціскам прамысловага перавароту і засіллем спажывецка-масавай культуры. Беларускі фальклор здолеў захаваць перадачу звычаяў у сям'і і традыцыйным соцыуме.

Ахова і выкарыстанне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў культурнай палітыкі краіны і грунтуецца на адпаведных прынцыпах Міжнароднай канвенцыі аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны і заканадаўстве Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей.

На развіццё народнай творчасці накіравана дзейнасць разнастайных фальклорных калектываў, з якіх каля 200 маюць назву «народны» ці «ўзорны». З іх ліку 38 фальклорных калектываў з назвай «народны» ці «ўзорны» знаходзяцца ў Брэсцкай вобласці.

У Віцебскай вобласці 25 фальклорных калектываў маюць адпаведнае найменне. Сярод іх найбольш вядомыя – гурт «Вярба» Дрысвяцкага сельскага дома культуры Браслаўскага раёна, народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Прасніца», Цэнтр фальклору Запрудскага Дома

культуры Глыбоцкага раёна, аўтэнтычны фальклорны гурт вёскі Ляды Дубровенскага раёна, заслужаны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Сунічкі» Стайскай школы традыцыйнай культуры Лепельскага раёна і інш.

У Гомельскай вобласці 61 фальклорны калектыў мае назву «народны» ці «ўзорны», сярод іх найбольш вядомыя – дзіцячы фальклорны ансамбль «Цярэшкавы шчодрыкі» Рассветаўскага культурна-спартыўнага цэнтра Акцябрскага раёна, народны фальклорны ансамбль «Стрэчанне» Жыткавіцкага раёна, народны фальклорны калектыў «Таняжаначка» Тонежскага сельскага Дома культуры Лельчыцкага раёна, народны фальклорны калектыў «Мяркулавіцкія вячоркі» Мяркулавіцкага сельскага дома культуры Чачэрскага раёна і інш.

Сярод калектываў Гродзенскай вобласці шырока вядомы ў нашай краіне і за яе межамі фальклорны гурт Погірскага сельскага клуба-музея народнага побыту і фальклорны гурт Ахонаўскага сельскага клуба-бібліятэкі Дзятлаўскага раёна, фальклорны гурт «Вялэйчанка» Вялэйкавіцкага сельскага клуба-музея Смаргонскага раёна.

У Магілёўскай вобласці 24 фальклорныя калектывы маюць назву «народны» і «ўзорны».

У Мінскай вобласці 23 фальклорныя калектывы маюць такую назву. Станоўчы вопыт па вывучэнні, захаванні і развіцці фальклору сваёй мясцовасці назапашаны фальклорнымі калектывамі: «Крупіцкія музыкі», «Калыханка» (Мінскі раён), «Ячаўскія вячоркі» (Слуцкі раён), Ананчыцкі фальклорны хор (Салігорскі раён), «Гасцінец», «Вянок» (Валожынскі раён), Морацкі фальклорны гурт (Клецкі раён), вясковыя гурты Любанскага раёна, якія сталі калектывамі-лабараторыямі, школамі майстэрства для ўсёй вобласці.

Пра новыя тэндэнцыі развіцця традыцыйнай творчасці сведчыць зварот да рэгіянальных і лакальных асаблівасцей фальклору. Аўтэнтычны фальклор стаў разглядацца як комплексная з’ява, знітаваная з традыцыямі і абрадамі беларускага народа, яго песенным, музычным, танцавальным, гульнёвым, дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам і навакольным асяроддзем. У найбольш спрыяльнай сітуацыі знаходзяцца вясковыя дзеці і моладзь, якія жывуць ва ўмовах жывога, актыўнага існавання развітой мясцовай традыцыйнай культуры. Яны маюць усе ўмовы для таго, каб засвоіць яе натуральным шляхам, яна становіцца арганічнай часткай іх жыцця. У асяродку жывой традыцыі і асабліва там, дзе традыцыйную культуру дзеці пераймаюць у сям’і, яе засваенне адбываецца натуральным чынам. Тут не патрэбны настаўнікі, бо вучыць сам лад жыцця, само натуральнае культурнае асяроддзе. Пры многіх аўтэнтычных гуртах ствараюцца дзіцячыя фальклорныя калектывы-спадарожнікі і арганізаваны працэс пераемнасці традыцый народнага мастацтва. Разам з мясцовай школай праводзіцца пастаянная работа па зборы, вывучэнні і засваенні фальклору разам з дзецьмі і моладдзю.

Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь надаецца найбольш адметным з’явам духоўнай культуры народа. Сёння ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей знаходзяцца 88 нематэрыяльных элементаў: 49 малюнкаў гербаў і 39 нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, а гэта рамёствы, абрады, песенныя стылі выканання, танцы, гульні.

Захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны выконвае функцыю перадачы ведаў, навыкаў, духоўна-маральных каштоўнасцей. У практычнай дзейнасці гэта павінна праяўляцца ў:

– стымуляванні і захаванні праяўленняў традыцыйнай культуры ў натуральных умовах яе бытавання;

– папулярызацыі традыцыйнага складу песенных, танцавальных, інструментальных калектываў;

– пашырэнні канцэртнай дзейнасці аўтэнтычных гуртоў;

– пошуку такіх форм творчых зносін носьбітаў фальклору розных мясцовасцей, якія б набліжаліся да натуральных побытавых;

– шырокім выкарыстанні аўдыё- і відэазапісаў з мэтай папулярызацыі традыцыйных форм культуры.

Асноўнымі праблемамі, якія існуюць у практычнай дзейнасці фальклорнай мастацкай самадзейнасці, з’яўляюцца:

– аднастайнасць форм работы (пераважна канцэртныя выступленні);

– слабае веданне аўтэнтычных традыцый мясцовасці;

– няўменне выкарыстаць традыцыі для надання адметнасці мастацкаму твару свайго калектыву;

– скіраванасць пераважна на забаўляльны характар канцэртных праграм, і адсюль – жанравастылявая аднабаковасць рэпертуару;

– капіраванне рэпертуару і манеры выканання прафесійных калектываў;

– адсутнасць аўтэнтычнай сцэнічнай атрыбуцыі.

**4. Задачы дзяржавы ў развіцці народна-традыцыйнай культуры.**

Адна з важнейшых задач дзяржавы – прадухіляць тыражаванне ў сродках масавай інфармацыі спажывецкіх форм падачы духоўнай спадчыны як элемента шоу-бізнесу, эфектыўна супрацьдзейнічаць пранікненню антыгуманістычных элементаў, іх разбуральнага ўздзеяння на культурную аўтэнтыку.

Да ліку важнейшых прыярытэтаў адносіцца **папулярызацыя айчыннай народна-культурнай спадчыны** для росту іміджу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне як важнага культурнага цэнтра Еўропы. Гэта будзе садзейнічаць пашырэнню сферы міждзяржаўнага супрацоўніцтва, росту інвестыцыйнай прывабнасці Беларусі, развіццю турызму, супрацоўніцтву з калектывамі народнай творчасці беларусаў замежжа.

**Дзяржаўная падтрымка роднай мовы** – асновы і найважнейшага носьбіта нацыянальнай культуры. Культурнае развіццё беларускага народа патрабуе захавання і развіцця роднай мовы як крыніцы нацыянальнай культуры ва ўсіх аспектах яе функцыянавання (у мастацтве, адукацыі, побыце і г.д.) і асновы самасвядомасці беларускага народа.

Асаблівасцю беларускай нацыянальнай культуры з’яўляецца яе **рэгіянальная разнастайнасць**. Падтрымка рэгіянальных культур прадугледжвае:

– захаванне рэгіянальных культурных традыцый;

– стварэнне аптымальнай інфраструктуры мясцовых культур з улікам спалучэння агульнанацыянальных і рэгіянальных тэндэнцый;

– этналагічнае даследаванне рэгіянальных культур на навуковым, навукова-асветніцкім і краязнаўчым узроўнях;

– развіццё і ўдасканаленне форм, спосабаў, шляхоў, сродкаў трансляцыі рэгіянальных культурных традыцый нашчадкам.

Культурная прастора Беларусі ўяўляе **сукупнасць культур разнастайных этнічных супольнасцей**: рускіх, палякаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў, татар, яўрэяў і інш. Захоўваючы сваю нацыянальную адметнасць, усе яны ўваходзяць у агульнанацыянальную культурную прастору беларускай дзяржавы.

Асноўнымі задачамі Праграмы супрацоўніцтва НАН Беларусі і Міністэрства культуры ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны з’яўляюцца:

– удасканаленне дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны;

– удасканаленне навукова-праектных рашэнняў для рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях;

– павышэнне ўзроўню навуковага кіраўніцтва;

– падрыхтоўка экспертных заключэнняў па аб’ектах матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны, прапанаваных для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

**Захаванне жывых традыцый** немагчыма без мэтанакіраванай і доўгатэрміновай навуковай падтрымкі. Такая падтрымка заключаецца ў сістэме метадаў, накіраваных на стварэнне:

– сацыяльна-эканамічных і арганізацыйных норм у галіне аховы і захавання аўтэнтычных форм нематэрыяльнай культурнай традыцыі;

– умоў для навуковай рэстаўрацыі аўтэнтычных традыцый і натуральнага асяроддзя іх існавання.

Неабходна каардынацыя паміж навуковымі ўстановамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, установамі культуры і адукацыі. Такая работа прадугледжвае вырашэнне праблем:

– арганізацыі і каардынацыі навуковых даследаванняў у галіне традыцыйнай культуры;

– метадычнага забеспячэння дзейнасці ўстаноў культуры: дамоў (цэнтраў) рамёстваў, фальклору, народнай творчасці і інш.

**5. Акадэмічная навука – захаванню і рэвіталізацыі культурнай спадчыны.**

Вядучай установай, якая вывучае праблемы айчыннай культуры, з’яўляецца Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Працай, у якой дадзена новая аб’ектыўная канцэпцыя этнагенезу і этнічнай гісторыі беларускага народа, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры, з’яўляецца трынаццацітомнае выданне «Беларусы», якому няма аналагаў у СНД і Еўропе. У 2009 годзе яно было ўдастоена Прэміі «За духоўнае адраджэнне». У манаграфіі «Беларусы. Сучасныя этнакультурныя працэсы» ўпершыню ў беларускай этналогіі на падставе матэрыялаў шматгадовых палявых экспедыцыйных даследаванняў, статыстычных і архіўных крыніц аналізуюцца асноўныя фактары этнакультурнай дынамікі.

Вядзецца сумесная работа над буйнымі рэгіянальнымі праектамі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў». Па выніках даследавання з друку выйшлі кнігі: «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў»: у 6 т.: «Магілёўскае Падняпроўе»; «Віцебскае Падзвінне»; «Гродзенскае Панямонне» (у 2 кн.); «Брэсцкае Палессе» (у 2 кн.), «Гомельскае Палессе» (у 2 кн.)».

Шырокай папулярызацыі народна-традыцыйнай культуры садзейнічаюць фундаментальныя працы «Турыстычная мазаіка Беларусі» (на рускай і англійскай мовах), «Нарысы гісторыі культуры Беларусі. Т. 1: Культура сацыяльнай эліты».

Супрацоўнікі аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў праводзяць збор і сістэматызацыю фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў у рэгіёнах, падрыхтоўку народных свят, фестываляў і конкурсаў мастацкай самадзейнасці. Прыкладам такога супрацоўніцтва можа стаць навукова-метадычнае суправаджэнне штогадовага міжнароднага фестывалю народнай творчасці «Фальклор без межаў» у Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці.

**6. Папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны і распрацоўка праектаў у сферы музеефікацыі.**

Матэрыялы, сабраныя этнамузыколагамі ў выніку шматгадовых экспедыцый, уключаны ў рэпертуарныя канцэртныя праграмы Беларускага дзяржаўнага народнага хору, Нацыянальнай харавой капэлы, ансамбля «Харошкі», рэгіянальных прафесійных і фальклорных калектываў. Даследаванні Цэнтра знайшлі прымяненне ў развіцці культурна-асветніцкай сферы рэгіёнаў. Народна-традыцыйная культура пастаянна папулярызуецца на штогадовых Днях беларускага пісьменства.

Праведзены цыкл заняткаў з удзельнікамі Рэспубліканскага навукова-практычнага семінара «Культурная спадчына як духоўная каштоўнасць у выхаванні і развіцці дзяцей і моладзі» (Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, кіраўнікі калектываў дэкаратыўна-прыкладной творчасці і спецыялісты ўстаноў пазашкольнага выхавання і навучання), для канцэрна «Белмастацпромыслы» пры Упраўленні справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праведзены Рэспубліканскі семінар для работнікаў аддзелаў культуры і музеяў, семінар-практыкум у г. Магілёве для работнікаў дамоў рамёстваў і музеяў.

Актыўная работа ажыццяўляецца на базе створанай у Цэнтры музейнай калекцыі. Штогод музей наведваюць каля 5 тыс. чалавек, на яе базе працуе вучэбна-метадычны цэнтр, штогод праходзяць практыку звыш 120 студэнтаў ВНУ. Музей шырока прадстаўляе мастацтва Беларусі на выстаўках за мяжой. Беларускім відэацэнтрам па фальклорна-этнаграфічных сцэнарыях знята серыя з 10 відэафільмаў: «Дажынкі», «Масленіца», «Купалле», «Вялікдзень», «Мой родны кут» і іншыя.

Праведзена кансультацыйная сустрэча і трэнінг ЮНЕСКА для экспертаў краін СНД «Умацаванне нацыянальнага патэнцыялу па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны». Прыняты Рэкамендацыі па ўмацаванні нацыянальнага патэнцыялу па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны для краін кластара Бюро ЮНЕСКА ў Маскве. Праведзены XV Міжнародны з’езд славістаў. У гэтых форумах прымалі ўдзел прадстаўнікі вядучых даследчых школ Еўропы, Паўночнай Амерыкі, Азіі, Аўстраліі.

На думку вучоных, у святле задач, пазначаных ААН, Еўрасаюзам, ЮНЕСКА ў сферы аховы развіцця сусветнай культурнай разнастайнасці як асновы стабільнасці і росквіту цывілізацыі, неабходна працягваць работу па:

– захаванні нацыянальных моў, моўнай і дыялектнай разнастайнасці;
– ахове фальклорнай спадчыны народнасцей і народаў;
– ахове нематэрыяльнай культурнай разнастайнасці;
– пашырэнні структуры Спісу сусветнай культурнай спадчыны;
– пашырэнні спісаў славутых імён.

У маштабах Еўропы, Еўрасаюза і ЮНЕСКА павінны быць вызначаны меры па ліквідацыі дысбалансу ў адносінах аховы і рэвіталізацыі гісторыка-культурнай спадчыны заходніх і ўсходніх рэгіёнаў Еўропы.

Пажадана большая адкрытасць з боку Еўрасаюза ў адносінах да Беларусі і іншых краін Усходняй Еўропы для пашырэння культурнага абмену, інтэграцыі гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі ў інфраструктуру еўрапейскага турызму, у спісы Сусветнай культурнай спадчыны.

Багатая культурная спадчына продкаў вызначыла высокі ўзровень і росквіт сучаснай беларускай культуры: народна-традыцыйнай і прафесійнай. На міжнародных фестывалях і конкурсах, выстаўках і біенале сучасныя беларускія артысты, музыканты, мастакі годна прадстаўляюць краіну. Еўрапейскія турысты і госці з усяго свету з цікавасцю знаёмяцца з Беларуссю, ахвотна наведваюць гарады, рэгіёны, запаведныя мясціны, помнікі, музеі. Ліквідацыя перашкод і развіццё культурнага супрацоўніцтва паміж Еўрасаюзам і Беларуссю паспрыяе і культурнаму ўзбагачэнню Еўропы, многія культурныя карані якой бяруць пачатак з беларускай зямлі.

**Заключэнне.** Дзеля забеспячэння захавання развіцця народна-традыцыйнай культуры неабходна вырашэнне рада навуковых праблем.

1. Захаванне і даследаванне агульных, рэгіянальных і лакальных рыс культуры павінны ўяўляць няспынны працэс. Менавіта так можна вырашыць праблему яскравага, устойлівага аблічча нацыянальнай культуры як часткі сусветнай культурнай разнастайнасці.

Нацыянальная культура – сукупнасць рэгіянальных і лакальных асаблівасцей. Апошнія вызначаюць як культурнае, так і эканамічнае, дэмаграфічнае развіццё рэгіёнаў, стрымліваюць міграцыю моладзі ў гарады і цэнтр, стымулююць творчую ініцыятыву мясцовых прадпрымальнікаў, прыцягненне знешніх інвестыцый.

2. Захаванне і развіццё нацыянальнай культурнай самабытнасці патрабуе пастаяннага навуковага аналізу тэндэнцый у прафесійнай культуры і мастацтве, суадносн асці ў іх традыцый і навацый, кансерватызму і авангарду. У міжваенны перыяд XX стагоддзя авангарднае мастацтва Беларусі, Віцебская школа аказалі вырашальны ўплыў на развіццё канструктывізму і авангардных школ Заходняй Еўропы і СССР. Навукова абгрунтаваны прагноз развіцця прафесійных мастацтваў дазволіць стварыць заслон агрэсіўным і разбуральным уздзеянням так званай масавай поп-культуры, якая адмаўляе традыцыі і агульначалавечыя каштоўнасці.

3. Складанай праблемай яшчэ з часоў былога СССР з’яўляецца пераадоленне адмоўнага балансу суадносін аховы і рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, страты, разбурэння і рафінавання іх першапачатковага аблічча. Варта скарыстаць методыку стварэння айчыннага Збору помнікаў (адзіны пасляховы праект, здзейснены ў былым СССР) і зрабіць яго перапрацаванае, дапоўненае новае выданне. Наспела выданне Збору рухомых помнікаў, многія з якіх ляжаць без рэстаўрацыі ў музейных запасніках, знішчаюцца ў царкоўных прыходах у выніку так званага паднаўлення і перапісвання.

Неабходна стварэнне нацыянальнага інвентару нематэрыяльных культурных каштоўнасцей і, нарэшце, нацыянальнага электроннага каталога і электроннай карты, адаптаваных да кантролю з дапамогай касмічнай навігацыі, трохмерных мадэлей помнікаў архітэктуры.

4. У сістэме адукацыі неабходна ўключыць у вучэбны працэс найноўшыя вынікі даследаванняў у галіне культуры, гісторыка-культурнай спадчыны, паходжання беларускага народа. Паглыбляць веды пра выдатных дзеячаў, іх уклад у сусветную культуру.

Варта адрадзіць традыцыю шэфства над помнікамі, летніх падарожжаў школьнікаў па памятных і славутых мясцінах, работу будатрадаў на аб’ектах культуры.

5. У сістэме інфармацыі на падставе сабраных за дзесяцігоддзі навуковых фондаў, калекцый і фундаментальных прац стварыць серыю тэм (відэа- і аўдыёперадач) старонак інтэрнэту дзеля папулярызацыі ўзораў нацыянальнай культуры, пазбягаючы спекулятыўных і псеўданавуковых

сюжэтаў, эпатажных ток-шоу, якія ператвараюць аўтэнтычныя сюжэты ў відовішча, скажаюць сапраўды эстэтычны змест мастацкіх народных твораў.

Неабходна імкнуцца да чысціні роднай мовы, пазбягаць яе засмечвання замежнымі тэрмінамі і выслоўямі, пазбаўленымі духоўнасці і зместу.

6. Шырокім кластарам культуры з'яўляецца тэатральна-відовішчная дзейнасць. Праблемай застаецца месца нацыянальнага рэпертуару на сучаснай сцэне, нацыянальнай драматургіі, сцэнаграфіі, канцэртнай дзейнасці. Даследаванні пазначаных праблем у ракурсе еўрапейскага кантэксту, пераклады і папулярызацыя беларускай літаратурнай класікі будуць спрыяць не толькі цікавасці еўрапейцаў, але і развіццю нацыянальнай драматургіі, тэатра, сцэнічнай культуры.

7. Пашырэнне выкарыстання нацыянальнай культурнай спадчыны ў сферы турызму – важны фактар развіцця культуры рэгіёнаў, стварэння свабодных эканамічных зон турысцка-рэкрэацыйнага тыпу, новых працоўных месцаў у галіне паслуг, фарміравання мясцовай інфраструктуры.

## Літаратура


1. Конвенция «О защите культурных ценностей в случае вооруженного конфликта» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.spravka-jurist.com/base/part-rq/tx_xswtfy.htm. – Дата доступа: 21.07.2011.
2. Конвенция «О мерах, направленных на запрет и предупреждение незаконного вывоза, ввоза и передачи прав собственности на культурные ценности» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://docs.pravo.ru/document/view/19708675/. – Дата доступа: 21.07.2011.
3. Конвенция «Об охране всемирного культурного и природного наследия» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://whc.unesco.org/archive/convention-ru.pdf. – Дата доступа: 21.07.2011.
4. Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия. Основные тексты. – Люксембург, 2011. – 103 с.
5. Конвенция «Об охране и поощрении разнообразия форм культурного самовыражения» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.ifapcom.ru/files/Documents/conv_cult_expression.pdf. – Дата доступа: 21.07.2011.
6. Доклад Президента Республики Беларусь Александра Лукашенко на четвертом Всебелорусском народном собрании [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.president.gov.by/press101782.htm#doc. – Дата доступа: 21.07.2011.
7. Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.pravo.by/webnpa/text.asp. – Дата доступу: 21.07.2011.
8. Закон «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.pravo.by/webnpa/text.asp. – Дата доступу: 21.07.2011.
9. «Пытанне аховы помнікаў перайшло ў новы якасны стан, і супакойвацца нельга» // Звязда. – 2011. – 19 ліп. – С. 4.
10. Об охране историко-культурного наследия: Закон Респ. Беларусь, 9 января 2006 г., № 98-З // Национальный реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2006. – № 9. – 2/1195.



*A. I. LAKOTKA*


**PEOPLE TRADITIONAL CULTURE AND THE STATE TASKS IN CONTEXT OF THE MODERN ETHNO-CULTURAL PROCESSES**

## Summary


This paper was presented to analyze problems of traditional material and intangible culture conservation and development and the State concern for support to the cultural authentic keepers, ethno cultural heritage sustentation and promotion in the world context.

Author of the paper has considered the problem of modernization process impact on tradition, the contradictions between mass and traditional culture, between modern urban lifestyle on the one hand and traditional way of life on the other.

Several scientifically proved recommendations have been suggested for conservation and development of national traditional heritage of Belarus.